# КАБ БЕЛАРУСАЎ НЕ МЕНШАЛА...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Таму трэба вырашаць пытанне з жыллём для сем'яў, асабліва для шматдзетных, якія павінны быць забяспечаны жыллём на працягу аднаго года з моманту пастаноўкі на ўлік. Дарэчы, сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць жыллё для 12 тысяч шматдзетных сем'яў.

Акрамя таго, прадстаўнік Мінпрацы і сацыяльнай абароны запэўніла журналістаў, што сацыяльныя гарантыі для сем'яў будуць захаваны. Ні Мінпрацы, ні іншыя дзяржаўныя органы на дадзены момант не працуюць над пытаннем скарачэння водпуску па доглядзе дзіцяці з трох гадоў да двух.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Кансультаванне для ўсёй сям'і

Яшчэ адна з прычын цяперашніх дэмаграфічных праблем — бясплоддзе сем'яў. «Прычым апошнім часам усё часцей прычына гэтага ляжыць у здароўі мужчыны», — кажа **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, экспертызы, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Таму цяпер Міністэрства аховы здароўя працуе над нарматыўна-прававым актам, паводле якога першая спроба ЭКА ў нашай краіне будзе бясплатнай. Акрамя таго, плануюцца змены ў Законе «Аб ахове здароўя», у прыватнасці прапануецца ўвядзенне перадабортнага кансультавання, і не толькі для жанчын — гэтую практыку хочуць распаўсюдзіць на ўсю сям'ю. Гэта значыць, што на падобную кансультацыю будзе запрашацца таксама муж або партнёр жанчыны.

## 3 інсультам — у спецыялізаванае аддзяленне

Сярэдняя працягласць жыцця ў нашай краіне цяпер 74,4 года. **Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Анатоль ДАШКО** адзначае, што па выніках мінулага года больш за 15 % жыхароў краіны былі старэйшыя за 65 гадоў. Калі тэндэнцыя захавецца, то да 2050 года іх доля павялічыцца да 25 %. Гэтая тэндэнцыя сведчыць пра тое, што нацыя старэе.

Пры гэтым павялічваецца колькасць сем'яў, якія сутыкаюцца з такой няпростай праблемай, як узроставая дэменцыя ў старэйшых членаў сям'і. Таму Міністэрства аховы здароўя і Мінпрацы думаюць над стварэннем спецыяльных цэнтраў для пажылых людзей з дэменцыяй.

Выклікае трывогу спецыялістаў і высокі ўзровень смяротнасці мужчын працаздольнага ўзросту — ён у 4,5 разы вышэйшы, чым у працаздольных жанчын. У сувязі з тым, што на першым месцы ў нас смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, Міністэрства аховы здароўя плануе абсталяваць міжрэгіянальныя і міжраённыя цэнтры ангіёграфіі і стварыць у іх спецыялізаваныя аддзяленні па лячэнні вострага каранарнага сіндрому, вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту, цяжкіх чэрапна-мазгавых траўмаў.

Сёння такая дапамога, па словах Алены Богдан, аказваецца ў Салігорску, Баранавічах, Пінску, Оршы, Мазыры. Дзякуючы гэтаму пацыенты з вострым каранарным сіндромам, інфарктам міякарда з прылеглых тэрыторый маюць магчымасць на працягу «залатой гадзіны» паступіць у цэнтр, дзе выконваюцца сучасныя лячэбна-дыягнастычныя ўмяшанні з пастаноўкай стэнта.

Таксама для павышэння даступнасці аказання медыцынскай дапамогі тэрапеўтаў пераводзяць на работу дактарамі агульнай практыкі. У пачатку гэтага года ўжо пачаліся пастаўкі неабходнага абсталявання для аснашчэння гэтых працоўных месцаў.

**Святлана БУСЬКО.**

# РЫХТУЙ ЦЕПЛАТРАСЫ ЛЕТАМ



*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

У прыватнасці, іспыты цеплasетак, якія праводзяцца ў міжацяпляльны перыяд, дазваляюць выявіць больш за 90 % усіх пашкоджанняў, якія існуюць у цеплaсетках. Статыстыка сведчыць, што дзякуючы гэтаму работа падчас сезона ацяплення праходзіць без прыцягльых аварыйных сітуацый.

У галіне ЖКГ сёлета праведзены іспыты 2628 кацельных, заменена 10 587 кіламетраў цеплaсетак, 28 неэканамічных катлоў, адрамантавана 518 тысяч квадратных метраў даху, 200 тысяч пагонных метраў стыкаў сценавых панэляў. Праведзена прафілактыка сістэм ацяплення ў 27 231 доме, зроблены іншыя работы. Генадзь Аксіловіч дадаў, што падрыхтоўка да асенне-зімовага перыяду вядзецца са штотыднёвым кантролем за часткай мерапрыемстваў і штомесячным кантролем за выкананнем большасці паказчыкаў.

Газавікі таксама актыўна рыхтуюцца да зімы. Насельніцтва ўжо закупіла 94,3 тысячы тон брыкету, аднак людзям раяць не цягнуць да апошняга з яго набыццём, каб не ствараць потым чэргі.

Газазабеспячальныя арганізацыі абследавалі 52,8 % падземных газаправодаў і далі ацэнку тэхнічнага стану амаль 60 % тых, што працуюць больш за 40 гадоў. Заменена 10 % газаразмеркавальных пунктаў, якія эксплуатуюцца звыш 20 гадоў.

На мясцовых відах паліва (МВП) у Мінскай вобласці працуе 544 крыніцы энергіі. У рэгіёнах вобласці сёлета запланавана ўстроіць шэсць кацельных агульнай магутнасцю 33,7 мегавата. Уведзены ўжо тры аб'екты. У выніку доля выкарыстання такога паліва арганізацыямі ЖКГ на Міншчыне дасягне 32,7 %. Гэта, у сваю чаргу, дазволіць замясціць 93,5 мільёна кубаметраў газу.

## ПАД НАГЛЯДАМ ГАЗАВІКОЎ

Пасля пачатку рэструктурызацыі Міністэрства энергетыкі з красавіка ў Беларусі створаны ўстановы дзяржаўнага энергетычнага газавага нагляду. На іх базе ўводзяцца і пачынаюць функцыянаваць газавыя інспекцыі, якія будуць займацца правіламі выкарыстання газу ў быце, паведаміў **Аляксандр АЗЯРЭЦ, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Дзяржаўны энергетычны і газавы нагляд».**

Работа распачата па ўсіх абласцях, і акцэнт робіцца на праблемных пытаннях, якія цягнуцца з году ў год. Напрыклад таких, як невыкананне арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, нездавальняючы стан цеплаізаляцыі трубаправодаў і абсталявання, невыкананне або няпоўнае выкананне гідрапнеўматычных прамывак і гідраіспытаў цеплаўстановак і цеплaсетак, адсутнасць у персаналу сродкаў электратэхнічнай абароны і запорных прылад на электраўстаноўках, а таксама знакаў бяспекі на шчытках прыбораў.

У краіне налічваецца 28 857 спажыўцоў цеплаэнергіі і 13 768 ведамасных цеплакрыніц.

*— Звяртаем таксама ўвагу на аўтаномныя крыніцы, якія павінны будуць падключацца ў выпадку нестандартных сітуацый у перыяд ацяплення, каб яны былі гатовы і спраўныя. Неабходна адсочваць таксама графікі абследаванняў тэхнічнага стану газавага абсталявання і ўнутраных газаправодаў жыллёвага фонду, у прыватнасці выдачу дакументаў аб праверцы працаздольнасці дымавых і вентыляцыйных каналаў.*

**У Ваўкавыску, напрыклад, гарачую ваду адключаюць у сярэднім на 10 сутак, у Навагрудку — на тыдзень, а ў раёнах Слоніма, якія абслугоўваюцца жыллёва-камунальнымі службамі, — увогуле на 3-4 дні.**

Задача энергетыкаў — прадугледзець усе магчымыя вузкія месцы накшталт расчысткі прасек ліній электраперадачы сумесна з лясгасамі, каб цепла- і электраэнергія паступалі да насельніцтва і на прадпрыемствы бесперабойна. Рамантуецца энергетычнае абсталяванне, мяняюцца і рамантуюцца цепла- і электрасеткі, праводзяцца супрацьаварыйныя трэніроўкі з аператыўным персаналам.

*— Рамонт электрасетак усіх класаў напружання выканаy на 46 %, гэта 11 774 кіламетры. 19 адзінак цеплатэхнічнага абсталявання адрамантавана і 17 знаходзяцца ў рамонце з 52 запланаваных на год. Гэтыя работы выконваюцца круглы год, бо гідраэлектрастанцыі, напрыклад Лукомская ці Бярозаўская, у асноўным рамантуюцца ўзімку, —* расказаў **Уладзімір БАБРОЎ, першы намеснік генеральнага дырэктара, галоўны інжынер «Белэнерга».** *— Сумесная з лясгасамі работа па ўпарадкаванні палос лесу, якія прылягаюць да прасек ліній электраперадачы, дазваляе зменшыць колькасць агульных адключэнняў, звязаных з дрэнным надвор'ем.*

Папаўняюцца аварыйныя запасы паліва, неабходныя для функцыянавання энергасістэмы ў крытычных сітуацыях пры недахопе забеспячэння прыродным газам. Перш за ўсё гэта мазут, якога цяпер у спецыяльных сховішчах больш за 320 тысяч тон з неабходных па плане 350 тысяч тон. Энергетыкі ўключылі ў работу яшчэ дзве лініі электраперадачы.

Сіламі энергетыкаў і атамшчыкаў уключаны ў нармальную работу пад поўны рэжым лініі Мінск-Паўночная і Смаргонь, што дадаткова павялічвае надзейнасць і эксплуатацыйныя магчымасці сетак айчыннай энергасістэмы.

**Ірына СІДАРОК.**

Запрашальнік

# У госці да Максіма

**Ужо ў гэту нядзелю адбудзецца паэтычны фестываль «Ракуцёўскае лета — 2019». У літаратурна-мемарыяльны музей Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» завітаюць нашчадкі паэта і Эміліі Луцкевіч.**

Арганізатары фэсту запрашаюць усіх ахвотных далучацца да свята — хто ведае, магчыма, пазней менавіта ваша гісторыя наведвання гэтага месца стане легендарнай?.. У 11 гадзін распачнецца прывітальная імпрэза каля памятных камянёў. Ужо праз гадзіну — літаратурна-музычная імпрэза. З 12 да 16 гадзін пройдуць майстар-клас па напісанні лімерыкаў і інтэлект-трэніроўка ад ПЭН-цэнтра, гульні «Падарожжа з Вільні ў Мінск», «Літаратурны кракадзіл», «Музейная шуфлядка», квэст па экспазіцыі, а таксама майстар-клас па выцінанцы.

Варта адзначыць, што ўжо мінула 25 год з таго моманту, калі літаратурна-мемарыяльны музей Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» прыняў першых наведвальнікаў. Менавіта ім, першым, пашчасціла акунуцца ў атмасферу старасвецкага фальварка, на свае вочы ўбачыць «Дом гаспадара», што ласкава прымаў беларускага паэта з далёкага Яраслаўля, наведаць экспазіцыю ў аднойленым «Дамку арандатара», зазірнуць у гумно і натаціць смагу з крыніцы «жывой вады», пра якую некалі напісаў паэт...

Цяпер у «Фальвараку Ракуцёўшчына» адкрылася экспазіцыя ў «Доме гаспадара». Яе экспанаты знаёмяць з жыццём былога гаспадара Вацлава Лычкоўскага і яго гасцей, апавядаюць пра Эмілію Шабуню і яе маленькую дачку Яніну, якія былі побач з Максімам два летнія месяцы і пакінулі ўспаміны пра маладога паэта.

У самых актыўных і спрытных гасцей ёсць магчымасць трапіць на свята ў складзе арганізаванай групы з Літаратурным музеем Максіма Багдановіча (тэлефон (8017) 334-42-69), кошт білетаў — 10—15 руб. Самастойна дабрацца ў фальварак можна на электрычцы Мінск—Маладзечна, Маладзечна—Мінск (станцыя Уша) ці маршрутным таксі Мінск—Краснае, Мінск—Маладзечна (вёска Краснае).

**Варвара ГОМАН.**